чтожено 8 повозок с грузом и 18 лошадей. Взято трофеев: 1 ручной пулемет, 6 винтовок. В ходе диверсий и в открытых боях убиты 280 и ранены 169 солдат и офицеров. Вместе с тем потери истребительных отрядов составили 18 человек убитыми и 9 ранеными.

Организационная структура истребительных батальонов, принципы комплектования личным составом, вооружение не претерпели по сравнению с 1941 г. существенных изменений. Однако начиная с 1943 г. истребительные батальоны как вспомогательная вооруженная сила были полностью подчинены наркомату внутренних дел. Их деятельностью руководил Штаб истребительных батальонов, который был крупным подразделением наркомата, а с 1 декабря 1944 г. Штаб истребительных батальонов был включен в состав Главного управления по борьбе с бандитизмом НКВД СССР. Командирами истребительных батальонов назначались начальники или заместители начальников районных отделов НКВД, заместителями командиров по политчасти – вторые секретари райкомов или заведующие военными отделами райкомов партии, начальниками штабов – опытные в военном деле оперативные работники НКВД.

По состоянию на 1 июня 1944 г. в Беларуси насчитывался 41 истребительный батальон численностью 3 393 человека и 914 групп содействия численностью 7 707 человек. В дальнейшем, там где еще не были созданы истребительные батальоны, принимались меры по их немедленному созданию, а в уже действовавшие вливались дополнительные силы – бывшие партизаны Великой Отечественной войны, комсомольцы, активисты из местного населения.

Истребительные батальоны и группы содействия, которые охраняли важные объекты в тылу наступающей Красной Армии, помогали саперным частям, собирали трофейное оружие, только в июле 1944 г. уничтожили более 2 тысяч и взяли в плен более 22 тысяч солдат и офицеров противника. За образцовое выполнение боевых заданий 77 бойцов и командиров истребительных батальонов и членов групп содействия им были награждены орденами и медалями СССР.

По мере ликвидации опасности для жизни и трудовой деятельности населения бойцы истребительных батальонов возвращались к мирному труду. Командный состав передавался частично в войска НКВД, причем подавляющее большинство офицеров направлялось на пополнение отделов и отделений по борьбе с бандитизмом местных органов НКВД.

УДК 351.74(476)(091):343.37

***І.А. Саракавік***

## БАРАЦЬБА МІЛІЦЫІ БССР З ЭКАНАМІЧНЫМІ ЗЛАЧЫНСТВАМІ Ў ПАЧАТКУ 90-х гг. ХХ ст.

Курс кіраўніцтва БССР у канцы 80-х гг. любымі сродкамі зберагчы ранейшыя цэны на тавары, асабліва шырокага ўжытку, у той час, калі ў суседніх саюзных рэспубліках яны прыкметна падаражалі, прывёў да таго, што з Беларусі шырокім патокам прадаўжалі вывозіцца рознага роду тавары народнага спажывання, прадукцыя вытворча-тэхнічнага прызначэння, сыравіна і матэрыялы. Па сутнасці, паўтарыўся прыклад сацыялістычных Чэхаславакіі і Венгрыі 70-х гг., калі іх тавары былі прыкметна таннейшыя, чым у суседніх СССР і Польшча і таму сталі адтуль вывозіцца польскімі і савецкімі грамадзянамі. Аднак тады ўрады ЧССР і ВНР прынялі адзіна правільнае рашэнне, каб абараніць сваіх грамадзян: павысілі прыкметна цэны на тавары і адэкватна павялічылі сваім грамадзянам зарплату.

Кіраўніцтва БССР не выкарыстала гэты вопыт і пайшло па не лепшаму шляху. 25 кастрычніка 1990 г. быў прыняты Закон БССР «Аб часовых мерах па абароне спажывецкага рынку Беларускай ССР», затым адпаведныя пастановы Вярхоўнага Савета БССР аб парадку яго прымянення, Савета Міністраў БССР ад 6 лістапада і 5 снежня 1990 г. Выконваючы гэтыя акты, органы ўнутраных спраў рэспублікі правялі канкрэтную работу. Яшчэ 17 кастрычніка 1990 г. быў выданы загад МУС БССР «Аб утварэнні кантрольна-прапускных пунктаў для кантролю за вывазам тавараў, прадукцыі і сыравіны за межы Беларускай ССР». У сваю чаргу, МУС СССР 27 кастрычніка 1990 г. сваім загадам абвясціў штаты 38 КПП на дарогах і 17 КПП на чыгуначных станцыях з колькасцю асабовага складу 600 чалавек і выдзеліў у 1990 г. на іх будаўніцтва і ўтрыманне адпаведныя сродкі.

Адначасова былі распрацаваны нарматыўныя дакументы, якія рэгламентавалі парадак дагляду транспартных сродкаў, адабрання, захавання, уліку, ацэнкі і продажу канфіскаваных тавараў, забароненых да вывазу і перасылкі з Беларусі, а таксама палажэнне аб парадку і ўмовах выдачы дазволаў і ліцэнзій на вываз (адпраўку) тавараў і іншых каштоўнасцей за межы рэспублікі. МУС БССР правяло ў лістападзе 1990 г. нараду са службовымі асобамі, адказнымі за рэалізацыю закона ад 25 лістапада, а 4 снежня 1990 г. – семінар з супрацоўнікамі органаў міліцыі, на тэрыторыі якіх знаходзіліся КПП, з удзелам кіраўнічых работнікаў Савета Міністраў БССР, Мінфіна, Мінгандлю, Белспажыўсаюза, Пракуратуры БССР, Вярхоўнага Суда і Мінюста БССР. Тлумачальная праца была праведзена і сярод насельніцтва.

За час дзеяння закона з 1 лістапада 1990 г. па 15 сакавіка 1991 г. быў выяўлены 1 371 факт незаконнага вывазу тавараў і каштоўнасцей на суму звыш 4,5 млн р., у тым ліку складанай бытавой тэхнікі на 1,4 млн р., будматэрыялаў – на 304 тыс. р., мэблі – на 111 тыс. р., вопраткі – на 530 тыс. р., харчовых тавараў – на 302 тыс. р., абутку – на 16,8 тыс. р.

У большасці выпадкаў тавары набываліся грамадзянамі на законных падставах у гандлёвых прадпрыемствах рэспублікі. Аднак мелі месца выпадкі, калі затрыманыя тавары набываліся ў магазінах у абход устаноўленых нормаў і правіл. Так, бармен рэстарана «Янтра» Магілёва Дзюба прадаў з падсобкі 10 бутэлек каньяку і 48 бляшанак кавы жыхару Шаўляя Істоміну, які быў затрыманы з гэтымі таварамі на КПП і аштрафаваны на 5 тыс. р., а супраць Дзюбы была ўзбуджана крымінальная справа. Жыхар Літоўскай ССР Арлекінас незаконна набыў у мінскім магазіне «Будматэрыялы» 640 м$^2$ дубовага паркету і быў затрыманы з ім на КПП «Варона» Астравецкага раёна. Супраць дырэктара магазіна Урублеўскага была ўзбуджана крымінальная справа.

Часам вывозімыя каштоўнасці выкрадаліся на прамысловых прадпрыемствах. Напрыклад, у снежні 1990 г. на КПП «Парэчча» Гродзенскага раёна быў затрыманы жыхар Літвы Вільнаўскас, які вывозіў 19 амартызатараў на суму 376 р. Разбіральніцтвам устаноўлена, што іх яму прадаў рабочы Гродзненскага завода «Аўтаагрэгаты» Абухоўскі, які іх украў па месцы працы. Рабочыя філіяла панчошна-трыкатажнай фабрыкі «КІМ» Лялюйко, Іванова і Гусакова ўкралі 660 жаночых калготак на 1,7 тыс. р., але былі затрыманы на КПП «Сураж» Віцебскага раёна. Першамайскі РАУС г.Віцебска па гэтаму факту ўзбудзіў крымінальную справу.

Практыка прымянення Закона «Аб часовых мерах па абароне спажывецкага рынку Беларускай ССР» паказала, па заключэнню МУС БССР, што гэта садзейнічала ўзмацненню барацьбы з рознымі злоўжываннямі і правапарушэннямі ў сферах вытворчасці, захавання і рэалізацыі тавараў народнага спажывання.

Аднак сусветны вопыт сведчыць: чым больш прадукцыі рэалізуецца ўнутры краіны ці вывозіцца за яе межы па цэнах, якія адлюстроўваюць становішча рынку, а не адвольна ўстанаўліваюцца на патрэбу палітычных інтарэсаў пэўных колаў грамадства, тым эфектыўней будзе працаваць эканоміка гэтай дзяржавы.

У многіх выпадках вываз прадукцыі прадпрыемствамі за межы Беларусі быў вымушаны, з мэтай вырашэння сацыяльных патрэб для сваіх працоўных калектываў ці вытворчых. У 1990 г. аб'яднанне «Гарызонт» прадало сваім работнікам 11 426 тэлевізараў (колькасць працуючых – 14 тыс.) і выдзеліла ўнівермагу «Беларусь» у Мінску для арганізацыі выязнога гандлю 3 тыс. тэлевізараў. Звыш устаноўленых фондаў гэтым аб'яднаннем атрымана 8 легкавых аўтамабіляў «Жыгулі» за пастаўку Волжскаму заводу тэлевізараў. У абмен на сваю прадукцыю вытворчае аб'яднанне «Атлант» набыло 46 аўтамабіляў ВАЗ, Мінскі гадзіннікавы завод – 6. Маладзечанскі трэст сталовых і рэстаранаў у парадку тавараабмену рэалізаваў у Азербайджанскую ССР 23 тоны масла, атрымаўшы ўзамен каньяк і кандытарскія вырабы.

Так рабілі і многія іншыя прадпрыемствы Беларусі. Карыстаючыся прадастаўленай ім самастойнасцю і не маючы свабодных грошай, яны значную частку выпускаемай прадукцыі рэалізоўвалі на іншыя тавары павышанага попыту, а таксама на сыравіну і матэрыялы для патрэб вытворчасці. Такія пастаўкі накіроўваліся ў асноўным за межы рэспублікі.

У гісторыі многае бывае пераменлівым. Калі да жніўня 1991 г. гэтыя факты лічыліся супрацьпраўнымі і супрацоўнікі міліцыі прыкладалі намаганні, каб яны не ажыццяўляліся, то з восені 1991 г. такі падыход стаў дзяржаўным. Кіраўніцтва Беларусі імкнулася, наадварот, пашырыць бартэрныя адносіны з суседнімі дзяржавамі. Зрабіць гэта прымусіла іх сама рэчаіснасць.

Толькі за 1990–1991 гг. міліцыяй Беларусі, якая выконвала загады дырэктыўных органаў, было зарэгістрыравана амаль 110 тыс. карыслівых злачынстваў, сума непрацоўных прыбыткаў склала 53,8 млн р., забрана грошай і каштоўнасцей на суму 18,4 млн р., канфіскавана прадметаў і каштоўнасцей на суму 3,4 млн р. і атрымана штрафаў на суму 7,6 млн р.

Такім чынам, міліцыя ў разглядаемы перыяд з'яўлялася надзейным звяном механізму дзяржавы і галоўнай арганізаванай сілай у барацьбе з эканамічнай злачыннасцю. Прымаемыя кіраўніцтвам СССР, БССР меры па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю былі палавінчатымі, не ўлічвалі рэальнага становішча як у грамадстве і дзяржаве, так і ў злачынным свеце. І таму пралікі, недахопы, памылкі вышэйшых органаў улады і кіравання вымушана была прымаць на сябе ў значнай ступені міліцыя.

Аналіз матэрыялу падцвярджае палажэнне аб тым, што злачыннасць – з'ява сацыяльная, існуе аб'ектыўна і будзе існаваць да таго часу, пакуль будзе існаваць само грамадства. Ранейшы афіцыйны савецкі тэзіс аб тым, што злачыннасць з'яўлялася «перажыткам капіталізму» не пацвердзіўся. Яна існуе ў дзяржавах з розным дзяржаўным і грамадскім ладам. Асаблівы рост злачыннасці адбываецца тады, калі парушаецца сацыяльна-эканамічны механізм дзяржавы, расце інфляцыя, назіраецца вялікае сацыяльнае расслаенне грамадства, праяўляецца слабасць, нерашучасць органаў улады і кіравання дзяржавы, а разам з тым і такога яе элемента, як міліцыя. Роля міліцыі прыкметна ўзрастае, калі павышаецца крымінагеннасць у краіне.

УДК 351.74

***А.В. Швайка***

## ИСТОРИЯ РАЗВИТИЯ ВНУТРЕННИХ ВОЙСК ВО ВРЕМЕНА ВЕЛИКОГО КНЯЖЕСТВА ЛИТОВСКОГО И РЕЧИ ПОСПОЛИТОЙ

Многолетняя история внутренних войск МВД Республики Беларусь свидетельствует о том, что на всех этапах своего развития эти войска занимали значительное место в общей структуре органов государственной власти, призванных укреплять правопорядок и внутреннюю безопасность страны.

Белорусские земли в Великом княжестве Литовском являлись полноправной составной частью территории этого государства, поэтому его история, достижения и успехи, неудачи и поражения, проблемы и противоречия – это наследство и нашей страны, это история и нашей Родины – Республики Беларусь.

С момента своего возникновения Великое княжество Литовское сталкивалось со многими внутренними и внешними проблемами. На протяжении XIII–XV вв., в период становления и укрепления государства, для наведения порядка в стране, соблюдения общественного спокойствия, сохранения территориальной целостности в случаях незначительной опасности применялся институт индивидуальных поручений. В случае серьезных проблем использовались вооруженные силы государства. Такая система объясняется неразвитостью органов государственного руководства в начальный период становления государства. По мере укрепления и развития государства складывалась определенная система управления страной. В разные периоды она имела разные составляющие. Но в середине XVI в., после масштабных государственных реформ, в стране был установлен единый аппарат управления. В чрезвычайных ситуациях для решения внутригосударственных проблем принцип привлечения вооруженных сил государства применялся и в XVI–XVIII вв. В этот период продолжал существовать также институт индивидуальных поручений в качестве средства обеспечения правопорядка, решения конфликтов и т. д. В основном он служил для снятия общественного напряжения мирным путем, особенно в начальных периодах развития конфликтных ситуаций. В составе лиц, обеспечивающих деятельность судов, существовала должность возного. Его компетенция распространялась только на те поветы, на которые он назначался. Во главе всех возных одного повета стоял генерал. Он имел право исполнять функции возного не только в пределах своего повета, но и на территории всего государства. В обязанности возного в основном входили функции судебного исполнителя, а также обязанность задерживать преступников на месте преступления или по горячим следам, проводить предварительное следствие, доставку задержанных (конвоирование) в суд. Конвоированию подвергались задержанные, обвиненные в совершении в основном тяжких уголовных преступлений.

В пределах государства по индивидуальным поручениям великого князя литовского часто вышеозначенные функции возных исполняли дворяне великого князя. В XV – начале XVI в. функции специального урядника по обеспечению правопорядка, исполнение судебных постановлений возлагались на вижей (децких). Однако их компетенция распространялась только на границы тех владений, где они занимали должность. С XVI в. на территории Беларуси существовала должность войского. В каждом повете было по одному войскому. Они освобождались от несения военной службы, но взамен были обязаны во время всеобщего воинского ополчения опекать и охранять их семьи, следить за порядком в повете. Причем для выполнения своих функций войские были наделены широкими полномочиями.